**ТЭМА. Правапіс е,ё,я**

МЭТА: Садзейнічаць засваенню правілаў вымаўлення і напісання галосных е,ё,я ў спрадвечнабеларускіх словах, паўтарэнню пастаноўкі націску ў словах, уменне дзяліць на склады;

Спрыяць развіццю ўважлівасці, памяці, умення працаваць у парах, пашырэнню слоўнікавага запасу школьнікаў;

Стварыць умовы для выхавання калектывізму, ветлівасці, павагі адзін да аднаго.

Ход урока

1. **Арганізацыйны момант.**
2. **Праверка д/з.** Уставіць прапушчаныя літары, калі ўпэўнены, што правільна напісалі, ставіце над словам "+".

Ж…мчуг, ж…мчужына, галантар…я, тун…ль, шніц…ль, лід…р, г…лас, г…ласісты, карат…, фламаст…р.

Скажы адным словам: адбіўная ці рубленая катлета; скразны калідор, прабіты ў гарах або пракапаны пад зямлёй; каштоўнае перламутравае рэчыва ў форме зярнят, якое здабываюць з ракавін некаторых малюскаў; дробныя прыналежнасці ўбору. ( словы з задання)

3. **Тэма, мэта ўрока. Стварэнне праблемнай сітуацыі.**

Гульня "У каго якое дзіця?"

Вавёрка - …, лось - …, мядзведзь - …, карова - …, ліса - …, цецярук - …
2 1    2 1    3 2 1    1    2 1    4 3 2 1

Ваверчаня´, ласяня´, медзведзяня´, цяля´, лісяня´, цецеручаня´. Паставім націск, абазначым склады перад націскам. Падзяліць словы на склады. Робім вывад. *У першым складзе перад націскам пішам* ***я.***

Якая мэта нашага ўрока? Вучні адказваюць.

4. **Фізкультмінутка**
5. **Чытанне правіла па падручніку і складанне апорных схем.**

1) Е → Я- лес- л<u>я</u>сні´к, Е застаецца- л<u>е</u>сніко´вы
1    2 1

2) Я – каранёвае – заяц, сувязь;

3) Я – у суфіксах – дробязь, сеяць.

4) пасля г,к,х у запазычагых словах- **е**

5) запомні : герой, медаль, пенал, зефір,
бензін, педаль, гепард, кефір,
секунда, бегемот, бетон,
берэт, легенда, фельетон,
герань, феномен, вазелін,
гектар, сеанс і апельсін.

Скласці па схеме: *ПЯТРУСЬ - ...*

**Цікава ведаць: -** калі вы не паставілі кропкі над ё, то гэта будзе памылкай;

- у 2005 годзе пастаўлены помнік гэтай літары (у Расіі);
- у новых "Правілах…" ё пішацца і не пад націскам у словах з коранем ёд-, ёт-: ёдапірын, ётаваны;

- напісанне *радыё-* (выпраменьваю, выпускаю промні)- радыёантэна, *радые-* (хімічны элемент) – радыеактыўны – радыяхімія.

Праца з падручнікам: пр. 13.
Дапаўненне апорнай схемы на правапіс е,я ў запазычаных словах ( пункт 4,5)
Пастаўце ў словах націск. Ці залежыць напісанне галоснай е ад месца націску? Не.
**6. Замацаванне**.
А) работа ў парах. Кожная пара атрымлівае заданне, дзе патрэбна ўставіць прапушчаныя літары, падкрэсленае слова- растлумачыць значэнне
1) дз…сяць – дз…с…ты, дз…с…тка, дз…с…ціна;
2) б…раг – б…рагавы, прыб…рэжны, б…ражок;
3) в…цер – в…траны, в…трыска, в…тракі;
4) п…сня – п..сняр, п…сняры, пес…ннік.
Б) Пр.16. Перакласці з рускай мовы на беларускую. Адзін вучань выконвае на дошцы, а астатнія ў сшытках.
В) Індывідуальная работа. Уставіць Е ці Я, праверыць па арфаграфічным слоўніку.
Г…рань, зав…зь, п…чатка, ан…кдот, м…дуза, дз…журны, дз…вяць, дз…вятка, к…фір, він…грэт, с…анс, л…мантаваць.
З класам: запісаць сказ, зрабіць сінтаксічны разбор, растлумачыць правапіс слоў.
*Цудоўны пейзажны малюнак вучні ўбачылі з акна свайго класа.*
Пейзаж – **малюнак прыроды**, карціна, рака. Назавіце ў гэтым слове галосныя літары, гукі. Калі **е** абазначае два гукі? Запішам транскрыпцыю слова *пейзажны.* Ці супадае колькасць гукаў і літар?
Праверка індывідуальнага задання.

**7. Абагульненне. Рознаўзроўневыя заданні.**
1. Падбярыце словы, каб **е,ё** перайшло б у **я.**
Мёд - …, пень - …, цёмны -…, зелень - …, зерне - …
2. Напісанне галосных у запазычаных словах вызначаецца па … слоўніку
3. Выпішыце ў адзін слупок, дзе ўставім **е,** а ў другі – **я.**
З…фір, дроб…зь, дз…сятка, кал…ндар, св…ткаваць, с…рыял, в…чоркі, м…лодыя, по…зд, сн…гавік.
4. Запісаць словы па-беларуску.
Весёлый сентябрь, новый лесник, красивый гербарий, высокий обелиск, весенний день.
5. Запішы адным словам.
1) Установа, якая ставіць спектаклі ____________
2) Міфічны герой, які жыве ў лесе ____________
3) Нажны рычаг у веласіпедзе ________________
4) Знак, якім узнагароджваюць за баявыя і працоўныя заслугі __________
5) Дрэва, якое адрозніваецца ад іншых колерам кары _____________

Пасля праверка, адказы на дошцы:
1. Мядок, пянёк, цямнец, зялёны, зярняты.
2. Арфаграфічным.
3. Зефір, серыял, мелодыя, поезд, снегавік

Дробязь, дзясятка, каляндар, святкаваць, вячоркі.

4. Вясёлы верасень, новы ляснік, прыгожы гербарый, высокі абеліск, вясенні дзень.

5. 1) тэатр, 2) лясун, 3) педаль, 4) медаль, 5) бяроза.

**8. Рэфлексія.**

З дапамогай рухаў вучні ацэньваюць сваю працу на ўроку.

- *Стоячы, рукі ўбокі – зразумеў усё;*
- *Седзячы, рукі на парце – не поўнасцю засвоіў тэму;*
- *Прысесці на кукішкі – працую толькі з апорнымі схемамі.*

**9. Падвядзенне вынікаў урока. Выстаўленне адзнак.**

*Складзіце слова – а, ы, ц, м, а, й, л*

**10. Дамашняе заданне**